Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»*

19 красавіка 2018 года, № 7 (2194)

АКТУАЛЬНА





Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

## У нумары:

**ДА 95 % ПРЫБЫТКАЎ ЗАСТАНЕЦЦА НА ФАКУЛЬТЭЦЕ**
Рэктар БДУ Андрэй Кароль наведаў філалагічны і фізічны факультэты, дзе былі разгледжаны пытанні агульнаўніверсітэцкага характару
*Стар. 2*

**60 КУРСАЎ МЕХМАТА**
Інтэрв'ю з дэканам ММФ Дзмітрыем Мядзведзевым з нагоды 60-годдзя факультэта
*Стар. 4*

**УЗАЕМАДЗЕЯННЕ 3.0: УНІВЕРСІТЭТ – ПРАЦАДАЎЦА – СТУДЭНТ**
Другі «Кар'ерны форум» сабраў больш за тысячу студэнтаў і 30 кампаній
*Стар. 5*

# Інстытут бізнесу створаць у нашым ўніверсітэце

ІБМТ і ДІКСТ аб'яднаюць у адзіны Інстытут бізнесу. Такое рашэнне прыняў Савет БДУ ў пачатку красавіка.

Апошнія паўгода ў БДУ праводзіўся сістэмны аналіз дзейнасці ўніверсітэта. Вынікі адлюстраваны ў стратэгіі развіцця ВНУ на сучасным этапе, дзе значная ўвага нададзена якасці адукацыі. Шмат у чым павысіць яго ўзровень дазволіць аптымізацыя структур дубліруючых спецыяльнасцяў. Пачатак гэтаму працэсу паклала аб'яднанне двух інстытутаў эканамічнага профілю.

Савет Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прыняў рашэнне развіваць бізнес-адукацыю ў БДУ па адной стратэгічнай лініі, так як ІБМТ і ДІКСТ ажыццяўлялі паралельную эфектыўную працу, але з рознымі канцэпцыямі. Папярэдне прайшлі саветы ў двух інстытутах, дзе разгледзелі праблемы і перавагі аб'яднання. «Мы павінны канкурыраваць на знешнім рынку, а не ўнутры БДУ», – пракаментаваў рэарганізацыю дырэктар ДІКСТ **Пётр Брыгадзін**.

«Аб'яднанне інстытутаў узмоцніць бізнэс-адукацыю ў Беларусі і створыць магутны аналаг вышэйшых школ эканомікі, якія існуюць у многіх элітарных універсітэтах свету», – адзначыў рэктар **Андрэй Кароль**.

У Інстытуце бізнесу працягнецца падрыхтоўка студэнтаў па пяці спецыяльнасцях і іх напрамках: «маркетынг», «менеджмент», «бізнес-адміністраванне (выкладанне на рускай і на англійскай мовах)»; «лагістыка» і «кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі». Будзе ўзмоцнена навучанне ў магістратуры і аспірантуры, на курсах перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі і інш.

Будучь таксама аптымізаваныя структуры спецыяльнасцяў факультэта філасофіі і сацыяльных навук і факультэта сацыякультурных камунікацый. Спецыяльнасці першай ступені вышэйшай адукацыі «сацыяльная работа (па напрамках)» і другой ступені вышэйшай адукацыі «сацыяльная псіхалогія», «рэабілітал огія», «псіхалогія» перададзены на ФФСН. Спецыяльнасці першай ступені вышэйшай адукацыі «дызайн (па напрамках)» і другой ступені вышэйшай адукацыі «асяроддзевы дызайн» будуць базіравацца на ФСК.

Рэарганізацыя двух інстытутаў не прывядзе да скарачэння ставак ПВС. Кафедры ўсім складам будуць пераведзены на профільныя факультэты і працягнуць сваю дзейнасць па спецыфіцы спецыяльнасцяў.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

РЭЙТЫНГІ

# Фактар навуковых публікацый

БДУ ў глабальным рэйтынгу ўніверсітэтаў Round University Ranking (RUR) за 2018 год заняў 18 месца ў свеце па паказчыку навуковых публікацый у супрацоўніцтве з замежнымі навукоўцамі.

Дадзены крытэрый адлюстроўвае колькасць навуковых публікацый у міжнародным суаўтарстве і сведчыць пра высокі ўзровень уключанасці даследчыкаў БДУ ў міжнародныя аўтарскія калектывы пры выкананні актуальных навуковых праектаў, у тым ліку па праекце Вялікага адроннага калайдара.



Belarusian State University

Belarus

Belarusian State University, Lieninhradskaja vulica 14, Minsk 220050, Belarus



| | |
|---|---|
| Foundation year: | 1921 |
| Short name: | BSU |
| Type: | Public |
| Students: | 27384 |
| Faculty: | 3021 |
| Faculty/Students Ratio: | 9:1 |
| Web-site: | www.bsu.by/en |

| Rankings | Rank | Score |
|---|---|---|
| World University Ranking | 706 | 28.246 |
| Teaching Ranking | 687 | 27.083 |
| Research Ranking | 671 | 22.632 |
| International Diversity Ranking | 483 | 42.180 |
| Financial Sustainability Ranking | 707 | 29.883 |

RUR з'яўляецца глабальным рэйтынгам універсітэтаў, які ўлічвае дасягненні 930 ВНУ свету. Іх ацэньваюць больш як па 20 асобных індыкатарах, згрупаваных па 4 напрамках: якасць выкладання, якасць даследаванняў, узровень інтэрнацыяналізацыі, узровень фінансавай устойлівасці.

У агульнай табліцы рэйтынгу БДУ займае 706 месца. З беларускіх універсітэтаў у яго таксама ўвайшоў БДМУ (772). Тройку лідараў склалі Гарвардскі ўніверсітэт, Універсітэт Чыкага і Каліфарнійскі тэхналагічны інстытут.

**Павел САЛАЎЁЎ**

## Весткі з рэктарата

**НАГРУДНАГА** знака «Выдатнік адукацыі» Міністэрства адукацыі ганараваны дэкан механіка-матэматычнага факультэта **Дзмітрый Мядзведзеў** за значны асабісты ўнёсак у развіццё навукі і інавацыйнай дзейнасці.

**ГАНАРОВЫМІ** граматамі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ўзнагароджаны прафесар кафедры сацыялогіі **Ларыса Цітарэнка** і загадчык кафедры філасофіі культуры **Анатоль Лягчылін**. Яны ўзнагароджаны за шматгадовую працу па падрыхтоўцы і атэстацыі навуковых і навукова-педагагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

**РЭКТАР** БДУ **Андрэй Кароль** сустрэўся з рэктарам Санкт-Пецярбургскага гуманітарнага ўніверсітэта прафсаюзаў (СПбГУП) **Аляксандрам Запясоцкім**. У ліку прыярытэтных было названа партнёрства ВНУ ў сацыяльна-гуманітарнай сферы.

Па словах Аляксандра Запясоцкага, СПбГУП мае ўнікальны досвед падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне канфліктологіі. Адзначана ўзаемная зацікаўленасць у абмене навуковымі кадрамі. Хуткім часам плануецца падаць беларускай ВНУ спіс навукова-даследчых прац, па тэматыцы якіх магчымая сумесная рэалізацыя грантаўскіх праектаў.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

*Каб скарыстацца мультымедыйным кантэнтам газеты:*




*1. Загрузіце на смартфон прыкладанне **HP Reveal***
*2. Падпішыцеся на канал **#bsuby***
*3. Навядзіце камеру на выяву з пазнакай*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ



Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

# Падтрымаць аспірантаў грантамі

Пытанні агульнаўніверсітэцкага значэння былі разгледжаны ў рамках працоўнага візіту рэктара БДУ **Андрэя Караля** на фізічны факультэт.

На сустрэчы членаў рэктарата з кіраўніцтвам і факультэта і кафедраў абмеркавалі шырокі спектр пытанняў. Былі разгледжаны тэмы запатрабаванасці выпускнікоў, павышэння якасці адукацыі абітурыентаў і студэнтаў, падрыхтоўкі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі. Абмяркоўваючы тэндэнцыю адкрыцця філіялаў кафедраў ва ўніверсітэце, удзельнікі сустрэчы падтрымалі меркаванне рэктара пра немэтазгоднасць гэтых структур, калі яны не забяспечваюць паўнавартасную практычную дзейнасць студэнтаў.

Актуальнай праблемай з'яўляецца якасць працы з заказчыкамі кадраў. Дадзенае пытанне адкрыта для многіх факультэтаў. Адзначана неабходнасць актыўнага ўзаемадзеяння з патэнцыйным працадаўцам. Сёння відавочная адсутнасць яго датычнасці ў падрыхтоўцы спецыялістаў. Разумення і бачання запатрабаванага спецыяліста няма і на факультэтах. «Пакуль назіраюцца два паралельныя светы. Важна фарміраваць у заказчыка запатрабаванне ў нашых выпускніках», – адзначыў рэктар БДУ **Андрэй Кароль**. У адпаведнасці з запатрабаваннямі заказчыка неабходны храналагічны план дзеянняў па падрыхтоўцы выпускнікоў, які ўключае мэты, механізмы супрацоўніцтва і адказных асобаў за ўзаемадзеянне з буйнымі прадпрыемствамі, карпарацыямі.

У разрэзе заяўленай праблемы загадчыкі кафедраў выступілі з ініцыятывай заключэння дамоў аб міждысцыплінарным супрацоўніцтве паміж БДУ і вядучымі холдынгамі. Гэта дазволіць адначасова многім факультэтам БДУ рыхтаваць спецыялістаў пад пэўную арганізацыю.

Удзельнікаў сустрэчы хвалявала пытанне падтрымкі маладых навукоўцаў. У БДУ распрацоўваецца палажэнне пра грантавую падтрымку аспірантаў з мэтай матывацыі своечасовай абароны дысертацыйных прац. Таксама было прапанавана падрыхтаваць крытэрыі эфектыўнай працы навуковага кіраўніцтва аспірантамі для зніжэння навучальнай нагрузкі на кіраўніка.

У цэнтры ўвагі было пытанне экспарту адукацыйных паслуг і гасдамоўнай дзейнасці факультэта. Павелічэнне прыбытку па гэтых напрамках дазволіць палепшыць матэрыяльна-тэхнічную базу і павялічыць аплату працы супрацоўнікам.

Загадчыкі кафедраў у выступленнях закранулі пытанні, якія тычацца адтоку магістрантаў у профільныя ўстановы, адкрыцця міждысцыплінарнай спецыяльнасці другой ступені вышэйшай адукацыі, забеспячэння навучальна-метадычнай літаратурай, забюракратызаванасці працэсу падпісання дамоў з базавымі арганізацыямі, а таксама нізкай наведвальнасці студэнтаў. Калегіяльна было прынята рашэнне пра распрацоўку рэгламенту допуску навучэнцаў да экзаменацыйнай сесіі.

Рэктарат БДУ таксама пазнаёміўся з экспазіцыяй музея фізічнага факультэта, партрэтнай галерэяй выбітных выпускнікоў і навукоўцаў. «Унікальная візітная картка факультэта і выдатная ідэя знаёміць абітурыентаў са знакамітасцямі фізфака», – ацаніў традыцыі і спадчыну факультэта рэктар БДУ Андрэй Кароль.

Напрыканцы сустрэчы кіраўнік ВНУ падзякаваў удзельнікам мерапрыемства за канструктыўны дыялог, які шмат у чым меў агульнаўніверсітэцкі маштаб.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

ВАЖНЫЯ РАШЭННІ

# Інстытут журналістыкі БДУ рэарганізуецца ў два факультэты

Дадзенае рашэнне аднагалосна прынялі члены Савета БДУ 13 красавіка.

Сёння актуальнай для БДУ з'яўляецца стратэгічная задача па павышэнні якасці адукацыі. Яе дасягненне ажыццяўляецца праз аптымізацыю структуры спецыяльнасцяў, стварэнне сістэмы дыстанцыйнага навучання, генерацыю фінансавых сродкаў. Стварэнне агульнаўніверсітэцкага факультэта цэнтралізуе дадатковую адукацыю па комплексе БДУ. Дадзенай структурай стане выведзены са структуры Інстытута журналістыкі факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі (ФПКП). Факультэту прысвояць статус адзінага навукова-метадычнага і каардынацыйнага цэнтра дадатковай адукацыі дарослых у комплексе ВНУ. Пытанне пра наданне самастойнасці структуры дэталёва абмяркоўвалася і прапрацоўвалася на працягу некалькіх месяцаў. «На шматлікіх факультэтах і інстытутах маюцца ідэнтычныя сегменты павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. Гэта стварае ўнутраную канкурэнцыю. Трэба пазбягаць дублявання спецыяльнасцяў па дадзеным адукацыйным напрамку, і стварыць адзіны магутны цэнтр у БДУ, які будзе працаваць на знешні і ўнутраны кантынгент слухачоў», – падкрэсліў рэктар Андрэй Кароль. Неабходнасць акумулявання наяўнага навукова-інтэлектуальнага патэнцыялу ў адной структуры, сыходу ад аднолькавых спецыяльнасцяў перападрыхтоўкі ў БДУ была падтрымана на Савеце практычна аднагалосна.

Наданне самастойнага статусу ФПКП абумоўлена пашырэннем яго дзейнасці ў галіне дадатковай адукацыі і экспарту адукацыйных паслуг. За дзевяць гадоў ФПКП праведзена больш за 250 адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі і навучальных курсаў, у якіх прынялі ўдзел каля 6000 слухачоў. Штогод адкрываюцца адукацыйныя праграмы і рэалізуюцца сумесныя праекты з шэрагам структурных падраздзяленняў БДУ.

Таксама члена савета разгледзелі пытанне пераназвання факультэта журналістыкі. Была адзначана неабходнасць змены назвы ў сувязі з актыўным развіццём існых напрамкаў падрыхтоўкі. На факультэце рыхтуюць кадры як для СМІ, так і для сферы публічнай інфармацыйнай прасторы Беларусі. Факультэт журналістыкі фактычна перастаў быць монафункцыянальным з 1996 года, калі пачалася падрыхтоўка па спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя». Па ініцыятыве кафедры тэхналогій камунікацыі ў 2013 годзе ў агульнадзяржаўны класіфікатар прафесій унеслі пасады «спецыяліст па сувязях з грамадскасцю» і «спецыяліст па рэкламнай камунікацыі». Гэта дазволіла легітымізаваць дадзеныя віды дзейнасці і забяспечыць выпускнікоў працоўнымі месцамі.

Пераназванне ў адпаведнасці з наяўнымі праграмамі падрыхтоўкі дасць магутны імпульс інавацыйнаму развіццю факультэта. Дарэчы, плануецца ў наступным навучальным годзе ўпершыню ў Беларусі адкрыць новую спецыяльнасць магістратуры «медыякамунікацыі».

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# Да 95 % прыбыткаў застанецца на факультэце

Рэктар БДУ Андрэй Кароль разам з членамі рэктарата абмеркавалі з кіраўніцтвам, загадчыкамі кафедраў, членамі савета філалагічнага факультэта праблемы агульнаўніверсітэцкага і лакальнага характару.

Быў адзначаны нізкі ўзровень гасдамоўнай дзейнасці факультэта пры досыць высокім інтэлектуальным патэнцыяле. «Да 95 % атрыманых прыбыткаў будзе заставацца на факультэце і размяркоўвацца паміж супрацоўнікамі, датычнымі да іх атрымання», – пракаментаваў Андрэй Кароль магчымасці палепшыць матэрыяльна-тэхнічную базу і павышэнне аплаты працы супрацоўнікам.

Адкрытымі застаюцца пытанні кадравай палітыкі на факультэце, а таксама невысокай задаволенасці студэнтаў выкарыстаннем выкладчыкамі прадуктыўных формаў і метадаў навучання. Пры гэтым кіраўніцтва БДУ ўказала на супярэчлівасць апошняга тэзіса. Некаторыя кафедры маюць паказальную практыку па выкарыстанні інавацыйных метадаў выкладання. Іх досвед можа быць карысны ў маштабах універсітэта. Таму было прынята рашэнне на рэгулярнай аснове праводзіць штогадовыя агульнаўніверсітэцкія навукова-метадычныя канферэнцыі па выкарыстанні сучасных формаў, метадаў навучання студэнтаў. У сувязі з гэтым вектар абмеркавання быў накіраваны на пытанне якасці адукацыі. Яго рашэнне было разгледжана праз змястоўны кампанент навучальнага працэсу, укаранення інавацыйных метадаў навучання і аптымізацыю структур шэрагу спецыяльнасцяў у БДУ. Была адзначана фінансавая, іміджавая, кіраўнічая немэтазгоднасць дублявання спецыяльнасцяў на розных факультэтах і інстытутах. Патрабуецца старанная праца структур па змене дадзенай практыкі, а таксама ўзважаны падыход да пытання адкрыцця новых спецыяльнасцяў і напрамкаў. «Недазвольна дапускаць унутранае размеркаванне кадраў па сумежных спецыяльнасцях на факультэтах, якое цягне страту зместу, якасці падрыхтоўкі і зніжэнне канкурэнтаздольнасці адукацыі», – адзначыў рэктар БДУ.

Загадчыкі кафедраў у сваіх выступленнях паказалі на моцныя бакі ўзначаленых структур, іх спецыфіку і ўнікальнасць. Таксама акцэнтавалі ўвагу рэктарата на праблемах лакальнага характару, у прыватнасці датычных парадку камандзіравання, квоты аспірантаў на аднаго кіраўніка, удзелу ў міжнародных навуковых мерапрыемствах, высокага кошту выдання навучальна-навуковай літаратуры ў БДУ. Акрамя таго, былі разгледжаны магчымасці ўкаранення на факультэце анлайн-пляцовак за адукацыйныя паслугі.

Філалагічнаму факультэту было таксама даручана прадумаць механізмы ўзаемадзеяння з факультэтам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДУ, якому хуткім часам прысвояць статус адзінага навукова-метадычнага і каардынацыйнага цэнтра дадатковай адукацыі дарослых у комплексе БДУ. Яго дзейнасць паспрыяе ўдасканаленню дадзенага напрамку на факультэтах шляхам арганізацыйнай падтрымкі і навучальна-метадычнага суправаджэння адукацыйнага працэсу.

Рэктар БДУ Андрэй Кароль падзякаваў усім удзельнікам сустрэчы за неабыякавае абмеркаванне актуальных для БДУ пытанняў і адзначыў адмысловую добразычлівую атмасферу на факультэце.

Гэты візіт прайшоў у рамках працоўных сустрэч рэктара з прадстаўнікамі факультэтаў ВНУ. Дадзеныя мерапрыемствы дазваляюць пазнаёміцца з супрацоўнікамі, калегіяльна прааналізаваць магчымыя праблемы і шляхі іх рашэння, а таксама праінфармаваць калектыў пра планаваныя рашэнні і змены ў кіраўнічым працэсе ўніверсітэта.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

ДЫСКУСІЯ

# Вышэйшая адукацыя ў сучасным грамадстве

**Уплыў працэсаў глабалізацыі і інтэграцыі на развіццё навукі і адукацыі разгледзелі беларускія і расійскія навукоўцы ў рамках круглага стала «Навука і адукацыя на этапе цывілізацыйных змен», які прайшоў у БДУ. Ключавой тэмай абмеркавання стала вызначэнне мадэлі вышэйшай адукацыі ў Беларусі і Расіі з улікам змен у сучасным грамадстве.**

Мадэратарам круглага стала выступіў рэктар БДУ **Андрэй Кароль**. Экспертамі з расійскага боку сталі акадэмік РАН **Вячаслаў Сцёпін**, рэктар Санкт-Пецярбургскага гуманітарнага ўніверсітэта прафсаюзаў (СПбГУП) **Аляксандр Запясоцкі**, шэф-рэдактар часопіса «Філасофскія навукі» акадэмік **Хачатур Марынасян**.

Ад беларускага боку ў абмеркаванні прынялі ўдзел дэкан ФФСН **Вадзім Гігін**, першы прарэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў **Святлана Вінакурава**, галоўны рэдактар «Часопіса БДУ. Сацыялогія» **Аляксандр Данілаў** і член грамадска-кансультацыйнага савета па пытаннях адукацыі пры Міністэрстве адукацыі Беларусі **Сяргей Мусіенка**.

Заяўленая тэма была разгледжана ў кантэксце культуралагічнага і філасофскага аспектаў, якія тычацца зместу, тэорыі і практыкі адукацыі. Былі канкрэтызаваны пытанні і новыя ідэі, якія вызначаюць напрамкі далейшага руху ў дачыненні да сістэмы адукацыі, сучаснага падручніка, стандартаў і навучальна-метадычнай літаратуры на мяжы стагоддзяў і культур.

Актыўна разгарнулася дыскусія па пытанні, якое тычыцца асноўнага заказчыка адукацыйных паслуг. Сёння ім у першую чаргу з'яўляюцца сам чалавек і дзяржава. Эканамічнае развіццё і бяспека краін магчымая дзякуючы інтэлектуальнаму патэнцыялу грамадства. Абмеркаванне прайшло ў кантэксце канцэпцыі чалавекаадпаведнай адукацыі, арыентаванай на творчую самарэалізацыю, індывідуалізацыю навучання і стварэнне асяроддзя для раскрыцця патэнцыялу навучэнца. Дасягненне гэтых мэт патрабуе метадалагічных змен, што дазволіць вырашыць праблемы плагіяту, матывацыі і адчужанасці ў адукацыі. Таксама ўдзельнікі разгледзелі тэму каштоўнасцяў і ролі настаўніка ў сучасным грамадстве.

Меркаванні ўдзельнікаў мелі рознапалярны і адначасова падобны па абагульненасці змест. Круглы стол дазволіў крытычна ацаніць існыя пазіцыі па шэрагу заяўленых пытанняў. «Дасягнута ўсведамленне вострых праблем, якія сёння стаяць перад праекціроўшчыкамі зместу адукацыі. Пакуль рана казаць пра гатовыя адказы, але важна ўсведамляць уплыў глабалізацыі ў свеце і паспрабаваць захаваць нацыянальную ідэнтычнасць і правесці яе праз сістэму нашай адукацыі», – рэзюмаваў вынікі круглага стала рэктар БДУ Андрэй Кароль.

**Ульяна МІНЧАНКА**

АСОБЫ

# Вобраз свету ў разуменні акадэміка Сцёпіна

**Прэзентацыя новай кнігі выбітнага расійскага і беларускага навукоўца, філасофа Вячаслава Сцёпіна «Чалавек. Дзеянне. Культура» прайшла ў бібліятэцы Інстытута журналістыкі і ФФСН па ініцыятыве кафедры сацыялогіі.**


Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Гэта сустрэча была асаблівая вызначальная тым, што БДУ – альма-матар прэзідэнта Расійскага філасофскага грамадства, акадэміка Расійскай акадэміі навук. У 1956 годзе ён скончыў аддзяленне філасофіі гістарычнага факультэта, далей – аспірантуру на кафедры філасофіі, пазней некалькі гадоў узначальваў гэту ж кафедру. Тут былі напісаны яго першыя навуковыя працы. Ён стаў Настаўнікам з вялікай літары, выхаваў пакаленне беларускіх філосафаў, стварыў у БДУ вядомую ў свеце Мінскую метадалагічную школу.

З часам сувязь з Беларуссю не была перапынена. З 1995 года ён з'яўляецца замежным членам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а ў 2009 годзе навукоўцу было прысуджана званне «Ганаровы прафесар БДУ» за заслугі ў развіцці гуманітарных ведаў, філасофіі і метадалогіі навукі, а таксама за вялікі ўнёсак у супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй.

Нагодай для сустрэчы стала новае выданне, якое было апублікавана ў рамках серыі «Ганаровыя дактары Універсітэта» Санкт-Пецярбургскага гуманітарнага ўніверсітэта прафсаюзаў (СПбГУП). Важкая кніга (800 старонак) складаецца з трох тэматычных частак, якія дзеляцца на 14 раздзелаў. Тыраж – 1000 экзэмпляраў. Як падкрэсліў Вячаслаў Сямёнавіч, галоўнае – каб праца не спынялася, адлюстраванне ідэй, думак у кнігах толькі натхняе, напаўняе сіламі.

**Аляксандр Запясоцкі**, рэктар СПбГУП, член-карэспандэнт РАН, на прэзентацыі выказаў меркаванне, што сёння можна па пальцах пералічыць філосафаў такога маштабу. Аўтары серыі «Ганаровыя дактары Універсітэта» – гэта асобы, якіх можна прад'явіць моладзі як персаніфікаваны вобраз універсітэцкага ідэалу. Яны дамагліся поспеху ў сваёй вытворчай і грамадскай дзейнасці, сімвалізуюць фундаментальныя і спрадвечныя каштоўнасці.

– У кнізе ёсць матэрыялы, якія публікаваліся раней, яны былі раскіданы ў іншых выданнях, зборніках, артыкулах, – сказаў Аляксандр Запясоцкі. – Вячаслаў Сямёнавіч зводзіць гэта ў сістэму адзінага погляду на чалавечую дзейнасць. Гэтыя кнігі зоймуць годнае месца ў бібліятэках Расіі і Беларусі. Студэнты атрымаюць унікальны матэрыял, бо адна кніга супрацьстаіць мізэрнай традыцыі кліпавага мыслення, калі моладзь можа выхопліваць асобныя фрагменты рэальнасці, не зводзячы іх у адзіны вобраз свету, а ў гэтай кнізе ўсё зведзена – толькі вазьміце яе з кніжнай паліцы і прачытайце.

У выданні працы вядомага філосафа аб'яднаны навуковым поглядам на свет прыроды, культуры, соцыуму і чалавека. Гэта разважанні аўтара пра сучасныя глабальныя крызісы, якія спароджаныя тэхнагеннай цывілізацыяй і патрабуюць перагляду ранейшых стратэгій яе развіцця. Тут жа разважаннямі навукоўца падзяліўся прысутны на мешчаны інтэрв'ю акадэміка пра сувязь паміж узнікненнем ідэй і зменамі ў сацыяльным становішчы.

– Гэта не проста крыніца інфармацыі, а нейкая з'ява, памкненне культуры, якое натхняе чытача на разважанні, – лічыць шэф-рэдактар часопіса Міністэрства адукацыі і навукі Расіі «Філасофскія навукі» **Хачатур Марынасян**. – Такім чынам, кніга становіцца фактычна настаўнікам, у такім усеагульным маштабе штурме можна прыйсці да адной роўніцы, асабістага адкрыцця.

Вячаслаў Сямёнавіч – прызнаны аўтарытэт у галіне тэорыі пазнання, філасофіі і метадалогіі навукі, філасофіі культуры, сацыяльнай філасофіі, гісторыі навукі. Ён стваральнік арыгінальнай канцэпцыі структуры і генезісу навуковай тэорыі, якая мае шырокае кола выкарыстання ў метадалогіі прыродазнаўчых, грамадскіх і тэхнічных навук. Як падкрэсліў на сустрэчы **Аляксандр Данілаў**, загадчык кафедры сацыялогіі ФФСН БДУ, у кнізе «Чалавек. Дзеянне. Культура» не проста ёсць працы, якія перадрукоўцца – кожная з іх нанова прагледжана, абдумана і дапоўнена. Аляксандр Мікалаевіч працытаваў доктара філасофскіх навук Сцёпіна: «Сапраўдным філосафам нельга стаць без сур'ёзнай самаадукацыі». Па словах загадчыка кафедры, у дзейнасці Сцёпіна вартае захаплення тое, што той паглыбіў свае веды ў іншых навуках, удасканаліў свой напрамак на розных узроўнях.

– У кнізе ёсць ідэя, якая разгортваецца ў розных галінах, – адзначыў Вячаслаў Сямёнавіч. – Да гэтага і імкнуўся, таму я пачынаю з разгорнутага аналізу навуковай карціны сацыяльнай рэальнасці. Павінен сказаць, што гэта ідэя ўзнікла на маіх лекцыях тут, калі працаваў у Белдзяржуніверсітэце. І сёння мне прыемна ўбачыць сваіх вучняў, якія шмат гадоў назад слухалі мае выступленні.

Прэзентацыя кнігі «Чалавек. Дзеянне. Культура» праходзіла ў цёплай атмасферы. На сустрэчу прыйшлі выкладчыкі, аспіранты, магістранты, студэнты БДУ, былыя вучні Сцёпіна, а цяпер супрацоўнікі сталічных ВНУ і навукоўцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнай электронікі і нанатэхналогій, тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій, інфармацыйных тэхналогій, тэорыі функцый, фізікі цвёрдага цела.

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі, філасофіі культуры, сацыяльнай камунікацыі, аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі.

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: інфарматыкі і камп'ютарных сістэм, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій, тэхналогій праграмавання, матэматычнага мадэлявання і кіравання, генетыкі, паліталогіі, неарганічнай хіміі, арганічнай хіміі, тэорыі функцый, матэматычнай кібернетыкі; дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, функцыянальнага аналізу і аналітычнай эканомікі, глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм, этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, прыкладной лінгвістыкі, англійскага мовазнаўства, псіхалогіі, філасофіі культуры, сацыялогіі, міжнародных адносін.

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: інтэлектуальных сістэм, інфармацыйных сістэм кіравання, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, тэорыі функцый, крымінальнага права, замежнай літаратуры, раманскага мовазнаўства, рускай мовы, прыкладной лінгвістыкі, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, сацыяльнай камунікацыі.

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: вылічальнай матэматыкі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

## БДУ ў СМІ Беларусі

**Аб адкрыцці Інстытута бізнесу БДУ** – «Звязда», zviazda.by, «Мінск-навіны», БелТА, Tut.by, sputnik.by, interfax.by, sb.by, radiomir.by (10.04) .

**Студэнты ФПМІ БДУ распрацавалі праект «3D-мадэль ступні па фатаграфіі»** – БелТА, wuz.by (30.03), grodnonews.by, «Гродзенская праўда», news.21.by (02.04), zviazda.by (04.04) .

**Круглы стол «Навука і адукацыя на этапе цывілізацыйных пераменаў» з удзелам беларускіх і расійскіх вучоных адбыўся ў БДУ** – sb.by, «СБ-Беларусь сегодня» (06.04), zviazda.by, «Звязда», rambler.ru, rg.ru (11.04), «СБ-Беларусь сегодня» / «Саюз. Беларусь-Расія» (12.04).

**Аб кірмашы вакансій Кітайска-беларускага індустрыяльнага парку «Вялікі камень»** – sb.by (04.05), БелТА (05.04), zviazda.by (07.04), «Мінск-навіны» (09.04), ecopress.by, радыё «Сталіца», 1 Нацыянальны канал Беларускага радыё (11.04), БелТА (13.04).

**БДУ ў глабальным рэйтынгу ўніверсітэтаў Round University Ranking (RUR)** – АНТ, telegraf.by, БелТА, sputnik.by, Tut.by, sb.by (11.04), zviazda.by, «Звязда», souzveche.ru (12.04).

**Інстытут журналістыкі БДУ рэарганізуюць у два факультэты** – БелТА, «Мінск-навіны», АНТ, СТБ, БТ-1, mail.ru, Tut.by, zviazda.by, kp.by, sb.by (13.04), sputnik.by (14.04).

**Кар'ерны форум «Узаемадзеянне 3.0» прайшоў у БДУ** – АНТ, Мінск-ТБ, радыё «Сталіца», 1 Нацыянальны канал Беларускага радыё, zviazda.by (02.04), БелТА, «Мінск-навіны» (03.04), sb.by, «СБ-Беларусь сегодня», БТ-1 (04.04).

**Аб падрыхтоўцы спецыялістаў у БДУ для касмічнай галіны** – СТБ, 1 Нацыянальны канал Беларускага радыё, 1prof.by, belchas.by (12.04).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З НАГОДЫ

# 60 курсаў мехмата

## Атмасфера, якая спрыяе і вучобе, і працы

Механіка-матэматычны факультэт у красавіку святкуе 60-годдзе. Яго жыццё напоўнена падзеямі, навуковымі дасягненнямі, выбітнымі асобамі. Што змянілася на факультэце за ўвесь час, і як ён жыве цяпер? Пра гэта распавёў дэкан факультэта кандыдат фізіка-матэматычных навук **Дзмітрый Мядзведзеў.** Дарэчы, ён быў адным з першых выпускнікоў спецыяльнасці «Механіка» 1980 г., а не так даўно ўзнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі» за значны асабісты ўнёсак у развіццё навукі і інавацыйнай дзейнасці.



### Летапіс з 1958 года

З году ў год механіка-матэматычны факультэт служыць навуцы і адукацыі, дапамагае студэнтам вызначацца са сваім месцам у прафесіі і жыцці. Падрыхтоўка спецыялістаў-матэматыкаў у Беларусі пачалася ў 1933 годзе з пераўтварэння фізіка-матэматычнага аддзялення ў фізіка-матэматычны факультэт БДУ. Пазней, у 1958 годзе, адкуль і вядзецца адлік, адбыўся падзел на матэматычны і фізічны факультэт. Яшчэ адно пераўтварэнне было ў 1975 годзе з адкрыццём аддзялення механікі, з тых часоў факультэт называецца як механіка-матэматычны.

– На станаўленне факультэта паўплывалі і тыя, хто стаяў ля яго вытокаў, – кажа Дзмітрый Мядзведзеў. – Гэта такія навукоўцы, як **Фёдар Гахаў**, **Дзмітрый Супруненка**, **Мікалай Яругін**, **Яўген Барбашын**, **Уладзімір Крылоў** і іншыя. Запрошаныя матэматыкі не былі выпускнікамі беларускіх ВНУ, яны прыехалі ў Мінск арганізоўваць, умацоўваць беларускую матэматыку. Іх з'яўленне стала велізарным штуршком у развіцці факультэта. Яшчэ асаблівы момант у гісторыі факультэта – гэта 1996 год, калі ў шэрагу традыцыйных спецыяльнасцяў «матэматыка» і «механіка» зарадзіліся новыя напрамкі «камп'ютарная матэматыка і сістэмны аналіз» і «матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі». Паступова гэтыя спецыяльнасці ператварыліся і дапоўніліся. Такім чынам, мы змагаемся за абітурыентаў, бо яны далёка не заўсёды, як нам здаецца, разумеюць, куды трэба паступаць. Таму, змяняючы назвы і напаўняючы іх якасным зместам, мы ад гэтага толькі выйграём.

### Навучальны працэс

На сённяшні ў склад факультэта ўваходзяць 10 кафедраў і навучальны цэнтр інфармацыйных тэхналогій, дзе працуюць 32 прафесары і дактары навук, 65 дацэнтаў і кандыдатаў навук. На факультэце навучаецца каля 1500 студэнтаў і магістрантаў дзённага і завочнага аддзяленняў. За 60 гадоў з дня заснавання выпускнікі і супрацоўнікі мехмата БДУ абаранілі больш за 150 доктарскіх і больш за 400 кандыдацкіх дысертацый.

– Кожная кафедра ўнікальная. Прафесіяналізм прафесарска-выкладчыцкага складу – наш здабытак, мы ганарымся гэтым, імкнёмся выкарыстоўваць патэнцыял у адукацыйным працэсе, навуковых даследаваннях. Напрыклад, на кафедры матэматычнай кібернетыкі працуюць 5 лаўрэатаў дзяржаўнай прэміі, заслужаны дзеяч навукі і 2 заслужаныя работнікі адукацыі, тут 8 дактароў навук – прафесараў. А на кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі, якая сваімі навуковымі даследаваннямі прынесціла прыбытак універсітэту, ёсць лабараторыя прыкладной механікі, дзе студэнты могуць замацаваць на практыцы веды, атрыманыя ў аўдыторыях.

Адміністрацыя факультэта імкнецца распрацоўваць навучальны план, дзе прадметы адпавядаюць тэндэнцыям індустрыі. У наш час вядзецца падрыхтоўка па 4 спецыяльнасцях: «матэматыка (па напрамках)»; «камп'ютарная матэматыка і сістэмны аналіз»; «матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі (па напрамках)»; «механіка і матэматычнае мадэляванне». Факультэт рыхтуе матэматыкаў, сістэмных аналітыкаў, спецыялістаў па інфармацыйных тэхналогіях, канструктараў праграмна-апаратных сістэм, выкладчыкаў матэматыкі і інфарматыкі, матэматыкаў-эканамістаў, матэматыкаў-прыкладнікоў.

– Часцей абітурыенты выбіраюць спецыяльнасць «матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі», а таксама «камп'ютарная матэматыка і сістэмны аналіз». Дарэчы, гэтыя спецыяльнасці ёсць толькі на мехмаце БДУ, больш у краіне такога няма, – адзначае Дзмітрый Георгіевіч.

Поле для практыкі – шырокае. Парк высокіх тэхналогій прадугледжвае ўдзел кампаній-рэзідэнтаў у падрыхтоўцы маладых спецыялістаў ва ўніверсітэтах у фармаце лабараторый. Прадстаўнікі IT-кампаній навучаюць студэнтаў навыкам, характэрным для іх скіраванасці. У падобных лабараторыях маладыя спецыялісты могуць праходзіць практыку, удзельнічаць у праектах прадпрыемства пад кіраўніцтвам выкладчыка. Студэнты мехмата папаўняюць свае веды ў лабараторыях EPAM Systems, EXADEL, HiQoSolutions, IBA Group, iTransition і Qulix Systems і іншых.

Акрамя гэтага кафедра тэарэтычнай і прыкладной механікі супрацоўнічае з «Беларуськаліем», дзе ў лабараторыі калійнага прадпрыемства студэнты могуць займацца геамеханікай, мадэляваннем прац у шахтах. А вытворца медыцынскіх імплантаў «Алцімед», НДІ траўматалогіі і артапедыі ўзаемадзейнічаюць з кафедрай біянанамеханікі.

– Чым прыцягвае факультэт студэнтаў? – разважае дэкан. – З майго пункту гледжання, гэта спалучэнне фундаментальнай падрыхтоўкі і магчымасці выкарыстоўваць яе ў прыкладных даследаваннях, таму што такая колькасць вядучых навукоўцаў дазваляе любому студэнту атрымаць першакласную адукацыю, якая стане падмуркам для далейшага развіцця. Мы спрабуем данесці да маладога пакалення, што матэматычныя метады выкарыстоўваюцца і ў эканоміцы, і ў інфарматыцы, і ў вытворчасці, і ў прыкладных даследаваннях.

### Міжнароднае супрацоўніцтва

У рамках міжнародных дамоў праводзяцца сумесныя навуковыя даследаванні, канферэнцыі і семінары, рэалізуюцца праграмы падрыхтоўкі спецыялістаў. Геаграфія – ад Аўстраліі да Канады, ад Японіі да Вялікабрытаніі. За апошнія гады на факультэце дзейнічае некалькі асноўных дамоў аб супрацоўніцтве ў галіне навукі і адукацыі. Гэта Універсітэт Беластока (Польшча), Універсітэт Ота-фон-Герыке і Універсітэт імя Фрыдрыха Шылера (Германія), Універсітэт Новага Пазара (Сербія), Універсітэт імя Паісія Хілендарскага (Балгарыя), Універсітэт Мадэны і Рэджыа Эмілія (Італія), Далянскі ўніверсітэт (Кітай), Пермскі нацыянальны даследчы політэхнічны ўніверсітэт (Расія). Па дамове БДУ з Харбінскім універсітэтам навукі і тэхналогій на факультэце ажыццяўляецца навучанне кітайскіх магістрантаў і аспірантаў. У рамках дамовы з факультэтам матэматыкі Універсітэта Ота-фон-Герыке рэалізуецца сумесная праграма падрыхтоўкі магістраў па спецыяльнасці «Камп'ютарная матэматыка».

– Сумесныя праграмы прыносяць толькі карысць навучэнцам, – разважае Дзмітрый Георгіевіч. – Гэта досвед іншай ВНУ, краіны і культуры, гэта новыя веды. Выкладанне ў тым жа Універсітэце Ота-фон-Герыке Магдэбурга можа весціся і на нямецкай мове, і на англійскай. Для таго, каб атрымаць дыплом першай ступені, трэба здаць іспыт па замежнай мове. Пасля такіх паездак студэнты часам змяняюць напрамак сваёй навуковай дзейнасці, бо цяпер больш цікавыя працы тыя, якія ідуць на стыку дзвюх навук.

### Студэнцкае жыццё

У студэнтаў мехмата ёсць магчымасці выявіць сябе на факультэце ў наступных моладзевых арганізацыях: студэнцкі саюз, савет старастаў, савет па якасці адукацыі, творчы саюз, прафсаюз і БРСМ. Кожны год увесну на факультэце праходзяць дні мехмата. Гэтыя некалькі дзён насычаны рознымі інтэлектуальнымі і спартыўна-забаўляльнымі мерапрыемствамі. Іх часта наведваюць і выпускнікі факультэта.

Са сцен мехмата выйшла шмат персон, якія сёння займаюць вядучыя пазіцыі ў сферы навукі і адукацыі, бізнесу і кіравання, эканомікі і IT-сферы. Сярод іх такія асобы, як **Сяргей Абламейка** (акадэмік НАН РБ, рэктар БДУ, 2008–2017), **Віктар Бабарыка** (старшыня праўлення ААТ «Белгазпрамбанк»), **Іван Гайшун** (дырэктар Інстытута матэматыкі НАН РБ), **Аляксандр Жук** (рэктар БДПУ імя М. Танка), **Міхаіл Жураўкоў** (міністр адукацыі, 2014–2016), **Віктар Корзюк** (акадэмік НАН РБ), **Аляксандр Машэнскі** (генеральны дырэктар СП ТАА «Санта Імпэкс Брэст»), **Уладзімір Платонаў** (акадэмік НАН РБ), **Уладзімір Сіротка** (генеральны дырэктар ТАА «СОФТКЛУБ»), **Сяргей Чыжык** (першы намеснік старшыні прэзідыума НАН РБ), **Вячаслаў Янчэўскі** (акадэмік НАН РБ) і іншыя.

Чым вылучаецца мехмат сярод іншых факультэтаў? Па словах дэкана, маюцца тры вялікія плюсы: унікальны набор спецыяльнасцяў, прафесарска-выкладчыцкі склад і атмасфера, якая спрыяе і вучобе, і працы. Па яго меркаванні, пачатак такой традыцыі паклаў **Мікалай Юрчук**, які двойчы быў дэканам. Менавіта яго чалавечыя якасці – мудрасць, спагадлівасць – як стыль зносін прыжыліся на факультэце.

### Планы і пажаданні

– Далей хочацца, каб мы змаглі знайсці магчымасці прыцягваць на працу на кафедры і ў лабараторыі крэатыўных, маладых і энергічных студэнтаў. Каб яны працягвалі сваю дзейнасць, якая прыносіць ім не толькі маральнае, але і матэрыяльнае задавальненне ў рамках нашага факультэта і ўніверсітэта.

А ў якасці пажадання студэнтам прывяду словы **Якава Радыны**. Ён больш за 40 гадоў кіраваў кафедрай функцыянальнага аналізу, якую фактычна і стварыў. Для яго адлік навучальных курсаў не заканчваўся з атрыманнем дыплома мехмата, як ён казаў, правучыўся каля 50 курсаў. Кожны год браў новыя планкі, бо вучыцца можна ўсё жыццё. Трэба студэнтам знаходзіць месца для сур'ёзнай вучобы, і гэта потым абавязкова спатрэбіца ў будучыні, – адзначае дэкан мехмата.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# Ідэі студэнтаў для Беларусі

**Студэнцкі праект БДУ «Экаўгнаенні для ўстойлівага развіцця сельскай гаспадаркі і зялёнай эканомікі» стаў абсалютным пераможцам у намінацыі «Аграпрамысловыя тэхналогіі і вытворчасць» рэспубліканскага моладзевага конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Яго аўтарамі выступілі трэцякурснікі хімічнага факультэта Лізавета Сяргеева-Някрасава і Максім Мацавіла. Таксама ў каманду распрацоўшчыкаў увайшла дзесяцікласніца гімназіі № 6 г. Мінска.**

Падвядзенне вынікаў адбылося ў рамках Міжнароднай выставы-прэзентацыі «100 ідэй для СНД». Выставачныя павільёны наведалі намеснік прэм'ер-міністра Васіль Жарко, міністр адукацыі Беларусі Ігар Карпенка, першы сакратар ЦК ГА «БРСМ» Андрэй Белякоў. Канкурсантаў ад БДУ падтрымала дэлегацыя на чале з рэктарам Андрэем Каралём.

Усяго інтэрактыўная выстава-прэзентацыя «100 ідэй для Беларусі» ўключыла ў сябе 120 аўтарскіх распрацовак. Праекты прадстаўлены ў 16 намінацыях у трох узроставых групах: 52 праекты прэзентавалі школьнікі і навучэнцы сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, 26 праектаў – студэнты, 42 – працоўная моладзь.

Рэалізацыя праекта студэнтаў БДУ прадугледжвае вытворчасць зручных ва ўжыванні экалагічных угнаенняў. Прапанаваны працэс безадходны і заснаваны на выкарыстанні біяраскладальнай, цалкам растваральнай у вадзе плёнкі, распрацаванай у лабараторыі НДІ ФХП БДУ.

Спецыяльна спакаваныя гранулы мікраўгнаенняў палягчаюць догляд за раслінамі, змяншаюць рызыку няправільнага ўвядзення падкормкі ў глебу і скарачаюць частату паліванняў за кошт паступовага выхаду дзейных элементаў і павольнага растварэння плёнкі.

У якасці асноўных кампанентаў угнаення выкарыстоўваюцца адходы буйнатанажных вытворчасцяў. У прыватнасці, лігнін, назапашаны на паліцах Беларусі ў колькасці больш як трох мільёнаў тон. Таксама склад уключае сумесь мона- і дыгідрафасфату калію, якая ўтрымліваецца ў адпрацаванай асаджальнай ванне новага працэсу атрымання гідратцэлюлознага валакна. Дадзены склад фарміруе канкурэнтныя перавагі інавацыі і забяспечвае яе эканамічную даступнасць.

**Ульяна МІНЧАНКА**

ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

**Другі «Кар'ерны форум» сабраў 3 красавіка ў «Прэзідэнт-атэлі» больш за тысячу студэнтаў і тры дзясяткі паспяховых кампаній, каб яны змаглі ўсталяваць трывалыя сувязі і знайсці найлепшы старт у прафесіі. Арганізавала вялікае кар'ерна-адукацыйнае мерапрыемства ўпраўленне кадраў БДУ.**







# Узаемадзеянне 3.0:
## універсітэт – працадаўца – студэнт



«Узаемадзеянне 3.0» – менавіта такі слоган у «Кар'ернага форуму», што значыць узаемадзеянне па сувязі «універсітэт–працадаўца–студэнт». Ён стаў працягам мадэлі «Універсітэта 3.0», якая прадугледжвае стварэнне ўнутры ўніверсітэтаў інтэграванага адукацыйнага, навуковага і прадпрымальніцкага асяроддзя для камерцыялізацыі навуковых распрацовак, а таксама павышэнне якасці і эфектыўнасці практыка-арыентаванай падрыхтоўкі спецыялістаў. «Такі падыход змяняе вектар адукацыі. «Кар'ерны форум» дазволіць выкладчыкам па-новаму зірнуць на працэс адукацыі», – адзначыў рэктар **Андрэй Кароль**. БДУ даручана распрацоўка і рэалізацыя эксперыментальнага праекта па ўкараненні новых падыходаў у развіцці вучэбнай, навуковай і прадпрымальніцкай інфраструктуры ўніверсітэта па мадэлі «Універсітэт 3.0». Важную ролю ў інавацыйнай канцэпцыі грае «Кар'ерны форум».

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт не толькі рыхтуе спецыялістаў, але і дапамагае знайсці месца працы. Для гэтага БДУ падпісвае дамовы з сур'ёзнымі ўстановамі, якія зацікаўленыя ў маладых перспектыўных выпускніках, і заахвочваюць іх дзейнасць. Але не ўсе прэферэнцыі студэнтам апошніх курсаў! Універсітэт прапануе і дамаўляецца пра месца стажыроўкі для студэнтаў малодшых курсаў. У перапынках паміж інфармацыйнымі блокамі студэнты маглі пазнаёміцца з 30 кампаніямі-ўдзельніцамі форуму, запісацца на сумоўе і стажыроўкі. «Для «Альфа-банка» гэта перш за ўсё магчымасць расказаць пра сябе як пра брэнд, які ідзе ў рытме з моладдзю, пра тое, якія людзі нам патрэбныя, пагутарыць з прэтэндэнтамі на вакансіі, даць параду і проста расказаць пра магчымасці. Усім прапаноўвалася запоўніць невялікую анкету з пазнакай, якая сфера цікавіць студэнта і чым ён хоча займацца ў банку. Студэнтам трэба загадзя задумвацца наконт працы, праходзіць практыку, розныя стажыроўкі, удзельнічаць у праектнай дзейнасці ва ўніверсітэце, валанцёрскіх праграмах. Часта кажуць, што пры працаўладкаванні у першую чаргу глядзяць на вопыт, а не на веды. Ініцыятыўнасць, камунікатыўныя навыкі, матэнакіраванасць, матывацыя — часам гэтыя якасці кажуць самі за сябе і цэняцца нашмат больш», – кажа HR-спецыяліст «Альфа-банка» **Юлія Алімбекава**.

Начальнік упраўлення кадраў БДУ **Наталля Няпеўная** падкрэсліла арыентаванасць форуму на студэнтаў і адзначыла патрэбу развіваць іх асобасныя навыкі. Для студэнтаў зладзілі 9 майстар-класаў, дзе вучылі ствараць рэзюмэ і будаваць паспяховую кар'еру. Папулярным стаў матывацыйны інтэнсіў «Актуальны ўчора, сёння, заўтра». Да трансляцыі падключылася каля 15 тысяч чалавек! «Самым цікавым, на мой погляд, былі майстар-клас па soft skills і матывацыйны інтэнсіў. Спікеры прыводзілі прыклады з уласнага вопыту, давалі разгорнутую інфармацыю. Больш за ўсіх зачапіла Аміна Ідыгава. Захапляльны чалавек, цікавая прэзентацыя і невераеградная энергетычная падача. На такіх людзей хочацца раўняцца і развівацца самому», – кажа студэнтка **Вольга Папова**.

На «Кар'ерным форуме» працавалі асобныя секцыі для студэнтаў, каардынатараў падраздзяленняў і кампаній.

Супрацоўнікі ўніверсітэта абмяркоўвалі ўдасканаленне ўзаемадзеяння ВНУ з заказчыкамі кадраў, умацаванне сувязі адукацыі і прадпрыемстваў на панэльнай дыскусіі «Узаемадзеянне 3.0». Таксама ў асобных лекцыях досведам падзяліліся выкладчыкі БДУ: пра ўзаемадзеянне з міжнародным бізнес-кам'юніці распавёў **Дзмітрый Марушка**, дацэнт і загадчык кафедры эканамічнай інфарматыкі; **Ірына Сідорская**, загадчык кафедры тэхналогій камунікацыі, расказала пра ўзаемадзеянне з заказчыкамі кадраў; **Сяргей Малы**, дэкан ФРКТ, падзяліўся доследам факультэта пра навуковыя даследаванні на замову бізнесу. HRM кампаніі Qulix Systems **Наталля Бурэц** распавяла пра дапамогу ў працаўладкаванні студэнтаў; пра праграмы працы са студэнтамі – **Любоў Курцэвіч** з Danone Belarus. БДУ сумесна з апошняй кампаніяй абмяркоўваюць рэалізацыю праекта «Зваротныя лекцыі». Выкладчыкі БДУ выступяць на прадпрыемстве, а прадстаўнікі Danone – ва ўніверсітэце.

Выкладчык факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій **Павел Пятроў** прадставіў кампаніям інтэрнэт-платформу ***cv.bsu.by***, на якой размяшчаюцца рэзюмэ студэнтаў БДУ. Студэнтам паспрабаваць сябе на імітаваным сумоўі можна было на speed-мітынгу з працадаўцамі, а загадзя – у конкурсе відэарэзюмэ. Навучыўшыся на двух майстар-класах, тры трэцякурсніцы: **Анастасія Петрушко** з Інстытута журналістыкі і **Валерыя Сільвановіч** і **Ірына Ходзька** з Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій – сталі пераможцамі конкурсу. Дарэчы, у ім прынялі ўдзел 24 студэнты, адзін – з Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Па словах намесніка начальніка ўпраўлення кадраў БДУ **Веранікі Дабравольскай**, кампаніі-ўдзельнікі вельмі задаволены арганізацыяй дадзенага форуму і зацікаўленасцю студэнтаў. Яго эфектыўнасць пацвердзілі таксама прадстаўнікі некаторых фірмаў, якія пабывалі на мерапрыемствах у якасці назіральнікаў і пасля пажадалі абавязкова паўдзельнічаць у наступным кар'ерным форуме.

**Надзея МАРХЕЛЬ**
***Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА***













# Выгадна ўсім: як аптымальна супрацоўнічаць з працадаўцамі?

Як сумясціць запатрабаванні працадаўцаў з магчымасцямі ўніверсітэтаў па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, абмеркавалі эксперты на панэльнай дыскусіі ў рамках «Кар'ернага форуму» БДУ.



## Бачанне працадаўцаў

**Наталля Чайлытка,** дырэктар кадравага цэнтра «Статус»:

– Распавяду пра праблемы, з якімі сутыкнулася ў сваёй практыцы. Выпускаецца значна больш спецыялістаў, чым патрабуецца для працадаўцаў, напрыклад, эканамісты, юрысты, нават будаўнікі ўжо не так запатрабаваныя... Кіраўнікі арганізацый адзначаюць, што хацелася б, каб ВНУ рыхтавалі спецыялістаў, якія прыйдуць на рынак бізнес-паслуг, у вытворчую сферу. Універсітэты павінны глыбей вывучаць запатрабаванні рынку. Калі гэты маніторынг будзе наладжаны і будуць выпускацца такія спецыялісты, то ў студэнтаў цяжкасцяў у пошуку працы будзе значна менш. Яшчэ ў 1966 годзе была распрацавана методыка скіраванасці прафесій (*тыпалогія прафесій Голанда – заўв. Рэд.*). Іх усяго 5. Таму калі ўвесці прафарыентацыйнае тэсціраванне ва ўніверсітэтах і па заканчэнні школы, то мы зможам пазбегнуць траплення студэнтаў не ў тую сферу, зменшыць нездаволенасць прафесіяй. Што да навучальнага працэсу, то я часта чую ад выпускнікоў: «Нас вучылі не практыцы, а тэорыі – і цяпер мы нікому не патрэбныя».

І напрыканцы адзначу, чаму «бюджэтнікаў» неахвотна бяруць працадаўцы. Наймальнік павінен быць упэўнены, што за 2 гады малады спецыяліст прынясе яму карысць. А калі выпускнік не дасць выніку, то кампанія нясе вялікія рызыкі, бо звольніць такога супрацоўніка нельга, а плаціць яму трэба. Даследаванне нашага цэнтра паказала, што 70 % студэнтаў павінны працаўладкоўвацца на перадапошнім курсе, тады ў іх ёсць шанец пасля ВНУ атрымаць такую ж працу: ужо будзе досвед і адпаведная зарплата.

**Сяргей Маркаў,** вядучы інжынер аддзела па рабоце з персаналам ІВА і выкладчык БДУ:

– У нашай кампаніі працуе шмат выпускнікоў па размеркаванні. Самыя лепшыя студэнты – гэта бюджэтнікі. Наадварот, ІТ-кампаніі лічаць плюсам тое, што студэнты адпрацоўваюць пасля выпуску два гады. Таму што добрых спецыялістаў можна ўтрымаць на два гады, бо яны мігруюць з праекта на праект. Студэнт вольны выбіраць праект з прыдатнымі ўмовамі каманднай працы, стаўленнем да спецыялістаў, узроўнем зарплаты. Цяпер асноўныя спецкурсы па выбары, практыка-арыентаваныя курсы, якія дазваляюць павялічыць кампетэнцыі, неабходныя для працы ў ІТ, даюцца ў магістратуры. ІТ-кампаніі запаўняюць гэты прабел, праводзячы свае трэнінгі і навучанне для студэнтаў 3–4 курсаў. Паколькі я прадстаўляю і кампанію ІВА, і ФПМІ БДУ, то ведаю, што нашы студэнты працуюць ужо з другога курса. Калі яны яшчэ ў школе займаліся робататэхнікай, то ўжо на малодшых курсах працуюць у кампаніі. Патрабуецца, вядома, кампраміс паміж вучобай і адукацыяй, таму што тады надаецца менш увагі навучальнаму працэсу. Наша адукацыя дае фундаментальныя веды, і нашы спецыялісты высока каціруюцца ў свеце.

Важнае пытанне амаладжэння выкладчыцкага складу, бо калі розніца ва ўзросце паміж студэнтам і выкладчыкам 50 гадоў, то вельмі складана знайсці разуменне: студэнт не атрымлівае патрэбных сучасных ведаў, не паглыбляецца ў мора інфармацыйных disruption technologies (*disruption – прарыў*). Сёння студэнты не ўспрымаюцца ў кампаніі як людзі, якія павінны адразу ўліцца ў праект і працаваць на ўзроўні тых, хто 5–8 гадоў у кампаніі. У сілу сваёй маладосці яны павінны прапанаваць вось гэтыя прарыўныя тэхналогіі, інавацыйныя метады і нестандартныя ідэі.

**Наталля Бурэц,** HRM кампаніі Qulix Systems:

– Выпускнікі БДУ складаюць вялікі працэнт супрацоўнікаў нашай ІТ-кампаніі. У нас працуюць матэматыкі, да іх падцягваюцца радыёфізікі, у якіх ужо ўведзены новыя спецыяльнасці, звязаныя з камп'ютарнымі тэхналогіямі. Для прыкладу, калі мы шукалі спецыяліста ў юрыдычны аддзел, яго начальнік загадзя сказала, што ў прыярытэце выпускнікі БДУ. Толькі пасля БДУ мы разглядаем рэзюмэ іншых спецыялістаў. Такія падыходы і ў іншых дэпартаментах.

## Бачанне прадстаўнікоў студэнцтва

**Крысціна Кутасава,** спецыяліст па персанале кампаніі Qulix Systems і выпускніца БДУ 2017 года:

– Кампанія Qulix Systems – мой першы працадаўца. Аднак у мяне быў актыўны шлях пошуку, да гэтага прайшла 17 сумоўяў, і ў выніку я атрымала дзве прапановы з сумежнымі функцыямі. А пра кампанію Qulix Systems я даведалася якраз на кар'ерным форуме БДУ 2017 года. Універсітэт прапанаваў мне яшчэ два варыянты працаўладкавання і нават выкладанне на кафедры.

Выбар напрамку спецыяльнасці ў мяне быў усвядомлены. На першым курсе нам выкладалі агульны менеджмент, потым можна было абраць напрамак – «кіраванне персаналам», «кіраванне нерухомасцю» ці «кіраванне фінансамі». Я доўга думала, у чым бы мне хацелася развівацца, і самая апошняя прынесла заяву на кафедру.

На сёння я адпрацавала ў кампаніі ўжо год. І вельмі задаволена тым, як усё склалася.

**Ульяна Чаркун,** студэнтка 2 курса факультэта філасофіі і сацыяльных навук:

– Мне пашанцавала, я студэнтка толькі 2 курса і планавала пайсці на працу з курса трэцяга, але цяпер ужо працую ў Медыяцэнтры БДУ. Месца я знайшла па ўласнай спецыяльнасці, а яна спецыфічная – «сацыяльныя камунікацыі». У медыяцэнтры прыдатная пасада знайшлася.

Магчымасці для студэнтаў ва ўніверсітэце ёсць, аднак іх бывае цяжка знайсці. На факультэце актыўна заклікалі шукаць практыку, але як, нам было невядома. Ёсць, зразумела, інфармацыйныя рэсурсы, парталы па пошуку працы, стажыровак, але знайсці сапраўды штосьці якаснае складана. Дапусцім, тыя ж групы «Укантакце» з аб'явамі «праца ў Мінску» прапануюць вакансіі грузчыкаў на адзін вечар, афіцыянта ў рэстаране, што таксама нядрэнна, але многія студэнты шукаюць працу па спецыяльнасці. І калі вы хочаце знайсці перспектыўнае месца, то трэба шукаць, з майго асабістага досведу, па знаёмстве: напрацоўваць сацыяльны капітал, хадзіць на мноства сустрэч, розныя канферэнцыі, любыя сумоўі, нават калі яны не пад сілу.

## Бачанне прадстаўнікоў універсітэта

**Вераніка Дабравольская,** намеснік начальніка ўпраўлення кадраў БДУ:

– Нюансаў у працаўладкаванні вельмі шмат. Не пагаджуся, нібыта мы рыхтуем не тых спецыялістаў, у якіх мае патрэбу галіна эканомікі. Раней, калі студэнт накіроўваўся па размеркаванні, наймальнік пра яго нічога не ведаў, акрамя спецыяльнасці ў дыпломе. А сёння для працадаўцаў адкрыта мноства магчымасцяў: можна зрабіць замову на падрыхтоўку пэўных спецыялістаў, прыйсці на адкрытую пляцоўку, тыпу кар'ернага форуму, і нават на размеркаванне. Дарэчы, мы можам размяркоўваць і «платнікаў».

Студэнты БДУ праходзяць практыку ў кампаніях ужо пасля першага курса. І мы ім таксама дапамагаем. З гэтага года запусцілі праграму «Практыкум пошуку працы», якая накіравана развіваць у студэнтаў новыя навыкі, навучыць іх правільнаму праходжанню сумоўяў. Таксама ў нас працуе сайт ***cv.bsu.by***, на якім у вольным доступе можна размясціць вакансію і рэзюмэ – і працадаўца можа паглядзець, якімі кампетэнцыямі валодае выпускнік БДУ.

Летась мы размеркавалі звыш 3 тысяч выпускнікоў, і пераразмеркаванняў – 3–5 %. І нічога дрэннага ў гэтым няма, калі выпускнік мае магчымасць знайсці сябе і калі працадаўцы ідуць яму насустрач. Так, для ўніверсітэта і спецыялістаў, якія курыруюць дадзеныя пытанні, гэта пэўная нагрузка, але, каб вырашаць гэтыя пытанні, існуе пляцоўка ўніверсітэта. Мы запрашаем усіх да ўзаемадзеяння як на кар'ерным форуме, так і да кропкавага супрацоўніцтва, пачынаючы з самых малодшых курсаў. У нас мноства актыўнасцяў, якія мы будзем шырока прасоўваць, каб працадаўцы мелі магчымасць непасрэднага кантакту. Мы рады ўсім і гатовыя да навін і прапаноў.

**Сяргей Ходзін,** прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі БДУ:

– Калі спрагназаваць на 5 гадоў наперад, якія спецыялісты будуць запатрабаваны, яшчэ можна, то сапраўды ведаць, кім ты захочаш быць і працаваць, толькі скончыўшы школу, даволі цяжка. Свет развіваецца вельмі дынамічна, кожны год змяняецца спецыфіка працы многіх спецыялістаў. Важна паспрабаваць правільна абраць напрамак і, галоўнае, быць творчым. Бо што сёння нас аддзяляе ад робата? Гэта творчасць. Мы рэкамендуем студэнтам ісці на практыку калі не ў тую кампанію, то хоць бы ў тую сферу, дзе яны збіраюцца працаваць. Практыка – выпрабавальны тэрмін як для студэнта, так і для працадаўцы.

Часта гучыць тэзіс, што ўсе ў гэтым ланцужку камусьці павінны. Але павінна быць толькі адно – узаемны рух насустрач: студэнт – універсітэт – заказчык кадраў. Безумоўна, абавязаны фарміравацца такія пляцоўкі, дзе ўсе бакі сустракаюцца, і чым раней, тым лепш.

Сёння нельга навучыць усяму на ўсё жыццё. Цяпер галоўны крытэрый – навучальнасць. Калі чалавек гатовы вучыцца і ў далейшым, нават па сумежных прафесіях, то ён свайго дарможацца.

**Віктар Шадурскі,** дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ:

– Я часта камунікую ў тым ліку з замежнымі працадаўцамі. Першы тэзіс: яны кажуць, што ў нас вельмі добрая адукацыя. Па ўсіх спецыяльнасцях. Другі тэзіс: любы працадаўца можа абраць «сваіх» людзей. Трэці тэзіс: нягледзячы на тое, што студэнты здольныя, яны трапляюць ва ўмовы жорсткай канкурэнцыі. У такіх жа ўмовах знаходзяцца і кампаніі. Таму старая звычка, што «вы мне падрыхтуйце вось таго, і каб ён адпавядаў вось таму» сёння не працуе. Вучыць студэнтаў складаць калькуляцыю, запаўняць дэкларацыі і запраўляць ложак у прэзідэнцкім нумары атэля ўніверсітэт не павінен. Выбачайце, але гэта працадаўца павінен на працоўным месцы даваць пэўныя навыкі, таксама павінен навучаць, але сваёй спецыфіцы. Мы рыхтуем студэнтаў, якія будуць працаваць у найбліжэйшыя 40 гадоў. Таму ўніверсітэцкая тэорыя – падмурак светапоглядны і культурны, які мы будзем закладваць нягледзячы ні на што. Студэнты на гэтым фоне будуць развівацца і вучыцца яшчэ некалькі дзясяткаў гадоў, да самай пенсіі. А вось калі чалавек не будзе ведаць культуру, замежныя мовы, асновы праграмавання, то ў гэтым можна ўгледзець прабелы адукацыі.

Размяркоўваючы нашых студэнтаў, мы адчуваем рынак і гатовыя дадаваць індывідуальную траекторыю навучання. Сёння прывязаць на 100 % нашы кадры да рынку мы не можам, бо рынак працы і рынак адукацыі – гэта трохі розныя рэчы. Калі абмяжоўваць рынак адукацыі толькі патрабаваннямі эканомікі, то таленавітыя студэнты з'едуць вучыцца, а потым і працаваць, у іншыя краіны.

Давайце ісці адзін аднаму насустрач: праводзіць мерапрыемствы ў розных фарматах, абмяркоўваць нашы рашэнні, выпрацоўваць рэкамендацыі. Адказнасць нясуць усе: універсітэт, працадаўца, дзяржава і, галоўным чынам, сам студэнт.

**Ксенія КАРАВАЯ,**
**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!



Фота Таццяны БАГАМАЗАВАЙ

# Карысны падарунак для абітурыентаў

Удзельнікамі чацвёртага праекта **«Студэнт БДУ на тыдзень»** сталі 114 абітурыентаў з Мінска і рэгіёнаў краіны, навучэнцы 10-х і 11-х класаў гімназій, сярэдніх школ і ліцэяў.



Цэлы навучальны тыдзень, з 26 па 30 сакавіка, дзеці знаёміліся з навучальнай і пазанавучальнай дзейнасцю БДУ. Усяго сваіх патэнцыйных студэнтаў прынялі 15 факультэтаў і інстытутаў: біялагічны, геаграфічны, гістарычны, механіка-матэматычны, фізічны, філалагічны, хімічны, эканамічны, міжнародных адносін, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, сацыякультурных камунікацый, філасофіі і сацыяльных навук, а таксама Інстытут бізнесу і менеджменту тэхналогій, Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава і Інстытут журналістыкі.

– Мы выходзім на якасна новы ўзровень у правядзенні праекта «Студэнт БДУ на тыдзень», – адзначае яго кіраўнік **Кірыл Карабан**, студэнт чацвёртага курса Інстытута журналістыкі і намеснік старшыні Студэнцкага саюза БДУ. – З гэтага часу ў нас яшчэ больш павышаныя патрабаванні ў першую чаргу да сябе як да арганізатараў. Вы спытаеце чаму? Прынамсі, мы сталі больш вядомымі і пашыраем гарызонты з кожным днём. Зараз абітурыенты, настаўнікі і бацькі па ўсёй краіне кажуць пра нас як пра якасны праект з вядучай ВНУ краіны, які сапраўды дапамагае зрабіць правільны выбар будучай прафесіі. Мы сталі якасней працаваць над папулярызацыяй праекта, для пачатку ў сталічных школах. Мы абнавілі правілы прыёму заявак, якія атрымліваем зараз з дапамогай гугл-формаў, а яшчэ дазволілі абітурыентам пісаць матывацыйныя лісты адразу на некалькі факультэтаў, каб у патэнцыйнага студэнта было больш шанцаў атрымаць запаветнае месца ўдзельніка. Адчуваючы адказнасць перад іншымі, мы сталі больш адказнымі самі. Ды і арганізатараў стала больш, значыць, з'явілася больш ідэй, а да ліку прымаючых далучыліся два новыя факультэты. Галоўнае – усё гэта робіцца не дарма, каментарыі і эмоцыі студэнтаў на тыдзень таму пацвярджэнне.

Фінальную сустрэчу ўдзельнікаў праекта, арганізатараў і адміністрацыі ўніверсітэта правялі на геаграфічным факультэце ў пяты, заключны, дзень. Дыпломы, якія сведчаць пра знаходжанне школьніка на вакацыях у сценах універсітэта, студэнты на тыдзень атрымалі з рук прарэктара па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях **Івана Янушэвіча**. Ён адзначыў, што Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – выдатная пляцоўка для навучання, атрымання якаснай адукацыі, рознага роду досведу і практыкі. Таксама пажадаў поспеху, спадзеючыся пешага верасня ўбачыць на лінейцы ўсіх студэнтаў на тыдзень. **Вячаслаў Малафееў**, як адказны сакратар прыёмнай камісіі, даў адказы на пытанні абітурыентаў. Ён таксама распавёў пра лічбы і даты, пра якія неабходна памятаць тым, хто паступае ў БДУ ў 2018 годзе.

Намеснікі начальніка ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю **Дзмітрый Лебедзь** і **Рыгор Пасрэднік** адзначылі сумленную працу студэнцкага саюза, падзякавалі ўсім куратарам на факультэтах за працу і таксама пажадалі абітурыентам поспеху ў паступленні.

– Пару гадоў назад былі з прарэктарам на канферэнцыі ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце. І тады студэнты, здаецца, з БДУІР прадставілі праект, дзе абітурыентаў таксама запрашалі паглядзець гэтак жа мінімальна на жыццё ўніверсітэта. Мы тады, напэўна, скептычна ўспрынялі гэту справу і нават паспелі забыцца, але літаральна праз некалькі месяцаў я даведаўся, што ў нас ва ўніверсітэце з'явіўся «Студэнт на тыдзень», – падзяліўся ўспамінамі Дзмітрый Васільевіч. – І ведаеце, наколькі мне вядома, цяпер у тым універсітэце падобны праект калі і ёсць, то не ў такім аб'ёмным фармаце, як у нас. Наш фармат унікальны. Мы моўчкі бяром і робім, што вельмі выдатна! Прыходзьце да нас і станавіцеся часткай актыву, ён у нас добры. У будучыні, напэўна, менавіта вы станеце арганізатарамі праекта.

Пакуль адзінаццацікласнікі думаюць толькі пра хуткае паступленне, здачу цэнтралізаванага тэсціравання і касцюмы на выпускны. Універсітэт цяпер – толькі мара, але той, у каго ёсць мара, не мае права на адгаворкі!

**Кацярына Жыгалковіч** (філфак):

– Праекту «Студэнт БДУ на тыдзень» я бясконца ўдзячная за падораныя эмоцыі, нянудныя сустрэчы і новыя веды. Асвоіцца ў новай ролі студэнта дапамаглі цудоўныя куратары, якія сталі для нас падтрымкай і апорай. Я б хацела падзяліцца незабыўнымі ўражаннямі пра сённяшні насычаны дзень. Яго мы пачалі з лекцыі па рускай мове, на якой працавалі разам са студэнтамі нароўні. Затым нас запрасілі на майстар-клас, дзе мы паклікалі вясну народнымі песнямі. Будзем верыць, што нашы старанні не пройдуць дарма, вясна пацешыць сонейкам і жаданым цяплом. Далей была доўгачаканая сустрэча з шаноўным дэканам факультэта Роўдам Іванам Сямёнавічам, які выклікаў сімпатыю да сябе пазітыўным настроем. На сустрэчы мы падзяліліся нашымі думкамі пра праект і планамі, падзякавалі за магчымасць пазнаёміцца з факультэтам. Час бяжыць: заўтра нас чакае закрыццё праекта, хоць так хочацца працягнуць час, які мы праводзім разам. Я буду раіць усім сябрам і знаёмым удзельнічаць у праекце, каб адкінуць перажыванні наконт паступлення на выбраны напрамак. «Студэнт БДУ на тыдзень» – карысны падарунак для абітурыентаў.



**Анастасія Барысёнак** (ФМА):

– З моманту, калі стала вядома пра мой удзел у праекце, мяне не пакідала пачуццё хваляванння. Але пасля сустрэчы з куратарам усе хваляванні адразу зніклі.



Першы дзень у якасці студэнткі БДУ праляцеў вельмі хутка і пакінуў толькі станоўчыя эмоцыі! Вельмі пацешыла сяброўскасць і зычлівасць студэнтаў, якія падыходзілі знаёміцца і распавядаць пра студэнцкае жыццё. Прыемная і цёплая атмасфера прысутнічае як у самой ВНУ, так і ў калектыве. Таму было адчуванне, быццам я вучуся на ФМА не першы дзень.

Ужо з першага дня знаходжання ў ВНУ я зразумела, што факультэт міжнародных адносін – гэта вельмі незвычайнае месца з самымі добрымі, спагаднымі студэнтамі і выкладчыкамі. Адкрыла для сябе займальны і цікавы новы прадмет – мытнае права. Пары праляцелі непрыкметна. З нецярпеннем чакала кожнай раніцы, каб ізноў прыйсці ў гэта дзівоснае месца!

**Даша Сярак** (Інстытут журналістыкі):

– У мяне самыя найлепшыя ўражанні! Улічваючы тое, што на восеньскі сезон прайсці я не змагла, радасць ад таго, што я ўсё-такі была студэнтам на тыдзень, павялічваецца ўдвая! Спадабалася абсалютна ўсё: і пары, і зносіны са студэнтамі, і падыход выкладчыкаў, і тая праграма, якая для нас была складзена. Хачу сказаць дзякуй нашым выдатным куратарам Юліі і Яраславу. Яны знаходзіліся з намі настолькі часта, наколькі гэта было магчыма, і сталі для нас сапраўднымі бацькамі на тыдзень!



**Наталля КАПАЦЭВІЧ**

СТУДЭНЦКАЯ ПЛЯЦОЎКА

# Майстэрства ў простым

**12 красавіка ў сценах геаграфічнага факультэта БДУ прайшла фінальная канферэнцыя і ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу навукова-даследчых работ «Навука на пальцах». ССЯА БДУ даў магчымасць студэнтам з усіх факультэтаў прадставіць працы ў абсалютна розных напрамках.**







Фота Аляксандра ВІННІКА

«Навука на пальцах» – гэта незвычайная студэнцкая канферэнцыя, дзе кожны можа выступіць перад аўдыторыяй аднадумцаў са сваёй навуковай працай або даведацца нешта новае.

– Праект з'явіўся ў 2014 годзе. Ініцыятарамі сталі студэнты, якія былі зацікаўлены ў стварэнні новага фармату канферэнцыі. Асаблівасць дадзенай канферэнцыі – прастата і зразумеласць выкладу, магчымасць прадстаўлення абсалютна розных тэм, у адрозненне ад звычайнай навуковай канферэнцыі са складанымі тэрмінамі. У нашым праекце больш робіцца ўпор на харызму выступоўца і падачу матэрыялу, – падзялілася са мной **Таццяна Жлутко**, старшыня ССЯА эканамічнага факультэта і па сумяшчальніцтве кіраўнік праекта «Навука на пальцах».

У гэтым годзе фіналістамі конкурсу сталі восем студэнтаў, аднак некаторыя прадставілі адразу некалькі прац.

**Марыя Краўчанка,** студэнтка юрыдычнага каледжа, выступіла з дзвюма працамі: «Дзе ёсць натарыус, няма месца канфлікту», «Ілжывыя сябры перакладчыка».

– Сама канферэнцыя прайшла вельмі цудоўна. Напэўна, ні адна канферэнцыя ў маім жыцці не праходзіла ў такой утульнай, хатняй атмасферы. Я нават не заўважыла, як праляцеў час. Асноўная ідэя канферэнцыі, без сумнення, знайшла адлюстраванне ў рэчаіснасці. Я атрымала велізарную колькасць новай інфармацыі. Закраналіся такія тэмы, якія наўрад ці можна абмеркаваць на пары і даведацца ў такіх падрабязнасцях. Гэта тое, што сапраўды актуальна і захапляльна. Дзякуй вялікае арганізатарам і ўсім, хто дапамагаў у стварэнні гэтага праекта! – падзялілася ўражаннямі ўдзельніца.

Дзяўчына выступае ўжо другі год. Таму прадставіць адразу дзве працы не было складана:

– У каледжы вучаць пераключацца як з аднаго прадмета на іншы, так і з адной галіны права на іншую. Гэты навык, несумненна, дапамог сабраць усе думкі і добра выступіць.

Цікавасць вучняў да канферэнцыі з кожным годам толькі ўзрастае. Удзельнікі і пераможцы папярэдніх гадоў працягваюць супрацоўнічаць, дапамагаць у арганізацыі праекта. Госцем і ўдзельнікам узнагароджання гэтага года стала **Сабіна Цярэшка**, пераможца «Навукі на пальцах–2017»:

– Можна сказаць, што я палюбіла гэты праект з першага погляду. Таму мне вельмі радасна зноў апынуцца ў гэтай атмасферы.

Пераможца вызначаюць па чатырох крытэрыях: аратарскае майстэрства, прастата выкладу, захаванне рэгламенту (10 хвілін), насычанасць і валоданне матэрыялам.

З усімі параметрамі бліскуча справіўся студэнт 2 курса эканамічнага факультэта **Арцём Латышаў**, які стаў пераможцам конкурсу навукова-даследчых работ «Навука на пальцах–2018».

Малады чалавек прадставіў увазе аўдыторыі незвычайную працу пад назвай «Гульніфікацыя», якая па сумяшчальніцтве з'яўляецца тэмай курсавой працы.

– Да канца не думаў, што выйграю, бо ўсе прадставілі сапраўды добрыя даклады і цікавую падачу, дзе я здолеў запазычыць для сябе шмат новага. У аўдыторыі было атмасферна і душэўна, а менавіта на такой публіцы прыемна выступаць, адчуваючы зацікаўленасць. Я ўжо не першы раз удзельнічаю ў падобнага роду канферэнцыях, і, на самай справе, гэта выдатны фармат, дзе спікеры могуць расказаць пра тыя тэмы, якія іх кранаюць і цікавяць, а студэнты адразу ж могуць задаць пытанні. Будучым удзельнікам хачу параіць браць тэмы, якія іх сапраўды хвалююць і бударажаць. А таксама самае галоўнае – быць душэўным, адкрытым і цікавым для публікі.

Арцём плануе далей развіваць тэму гульніфікацыі і ўжо цяпер разам са сваімі калегамі знаходзіцца на стадыі распрацоўкі мабільнага прыкладання для ўніверсітэта, з якім прыме ўдзел у моладзевым праекце БДУ.

Прызёрамі конкурсу сталі **Эльжбета Скшыдлеўска**, студэнтка 4 курса юрыдычнага факультэта, якая прадэманстравала працу «Псіхалогія вобыску» і **Дар'я Карэтка**, магістрантка гістарычнага факультэта, з працай «Гістарычная рэканструкцыя як форма аховы гісторыка-культурнай спадчыны на прыкладзе рэканструкцыі вайны 1812 года».

Сапраўды, мы павінны зразумець, наколькі навука патрэбная ў жыцці, а менавіта такая студэнцкая канферэнцыя, дзе пануе міждысцыплінарны падыход і кожны з прастатой і лёгкасцю распавядае пра сваю тэму, жадаючы данесці яе да слухачоў з іншых факультэтаў.

– Праект «Навука на пальцах» быў для мяне першым вопытам як для старшыні ССЯА БДУ, але скажу: тое, што мы планавалі, атрымалася на добрым узроўні. І хацеў бы падзякаваць усім тым, хто прымаў удзел і дапамагаў нам, – падзяліўся **Артур Кандраценка**, старшыня ССЯА БДУ, арганізатар і член журы конкурсу. – Прыходзьце, калі вы сапраўды хочаце нешта даведацца, каму цікава, што адбываецца ў навукова-даследчай сферы не толькі ў межах БДУ, але і ў Беларусі, у свеце ўвогуле. Дзякуючы канферэнцыі «Навука на пальцах» вы пашырыце свой даляглад і зробіце важны першы крок да беларускай навукі.

**Ірына ЛУКАШЫК**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# На сцэне – душа

## У БДУ прайшоў «Тэатральны тыдзень»

**Ужо па традыцыі напярэдадні Міжнароднага дня тэатра праходзіць фэст-праект «Тэатральны тыдзень у БДУ». Убачыць найлепшыя пастаноўкі студэнцкіх тэатраў ВНУ можна было з 21 па 27 сакавіка. Арганізатарам «Тэатральнага тыдня» стала ўпраўленне па справах культуры БДУ.**

У знак удзячнасці ўсім, хто стварае і любіць гэта шматграннае мастацтва, 27 сакавіка святкуецца Міжнародны дзень тэатра. У сувязі з гэтым для папулярызацыі тэатральнай творчасці сярод універсітэцкай моладзі праводзіцца «Тэатральны тыдзень у БДУ». Праграма складалася з рэпертуараў двух студэнцкіх тэатраў: «На балконе» і «На філфаку». Уваход на ўсе пастаноўкі быў вольны.

Адкрываў тэатральную эстафету народны студэнцкі музычна-драматычны тэатр-студыя «На філфаку» прэм'ерай «8 кахаючых жанчын» па матывах п'есы французскага пісьменніка Роберта Тома. Прэм'ерны паказ гэтай камедыі-дэтэктыва прайшоў раней, 2 сакавіка, у сценах актавай залы на вул. Карла Маркса. Гледачоў сабрала гісторыя, якая адбылася ў Францыі ў 1950-х. Восем жанчын рыхтуюцца адзначаць Каляды, аднак свята азмрочвае забойства гаспадара дома. Пад падазрэннем знаходзіцца кожная.

Як распавядае мастацкі кіраўнік студыі «На філфаку» **Кацярына Тананайка**, паставіць спектакль, дзе ўсе ролі былі б жаночымі, задумвалі даўно. Разглядаючы варыянты для новай пастаноўкі, узгадалі адпаведны французскі фільм. Калі зацвердзілі гэту ідэю, правялі кастынг, падабралі актрыс, адрэпеціравалі сцэны. Думаем, гледачам было цікава паглядзець на тое, як жанчыны, крываdушнічаючы і плятучы інтрыгі, могуць давесці каго заўгодна.

– Лічу, любіць тэатр можна абсалютна за ўсё, – дзеліцца Кацярына Тананайка. – Тут разам зліваюцца танец, музыка, вакал, літаратура – усё на адной сцэне. Гледачам варта прыходзіць у тэатр для таго, каб расслабіцца, атрымаць уражанні, з задавальненнем правесці вольны час. Вялікая карысць тэатра для студэнтаў-акцёраў, якія ходзяць займацца ў студыю. Гэта штуршок для развіцця: майстар-класы па пастаноўцы маўлення, харэаграфіі робяць маладых людзей лепшымі. Тут яны могуць пашырыць даляглядl, прымерыць на сябе іншую ролю.

Акцёры народнага студэнцкага тэатра «На балконе» прадставілі дзве пастаноўкі. Прэм'еру «Шкляны звярынец» па матывах п'есы амерыканскага драматурга Тэнэсі Уільямса ўпершыню акцёры паказалі гледачам яшчэ 20 студзеня. Тут героі мараць пра сваё шчасце, дзе не будзе адзіноты. Перад імі стаіць складаны выбар: паддацца сваім жаданням ці адмовіцца ад іх дзеля блізкіх людзей. Якія наступствы прынясе рашэнне гэтай дылемы?

Рэжысёр пастаноўкі – Ягор Наймарк.

– Тэатр можна або любіць, або не. У маім выпадку любоў да тэатра – гэта калі ты не бачыш свайго існавання без яго, – лічыць мастацкі кіраўнік тэатра «На балконе» **Дзмітрый Цішко**. – Што можа даць тэатр? Што заўгодна. Галоўнае – мэта твайго прыходу. Гледачы ідуць сюды, каб адпачыць, атрымаць эмоцыі, падумаць, хтосьці проста выпадкова забег. Студэнты-акцёры ж могуць рэалізоўваць свае творчыя жаданні і запатрабаванні, навучыцца быць раскаваным, не баяцца публічнасці. Мне здаецца, гэта важна для студэнтаў, будучых прафесіяналаў сваёй справы. Аднак я думаю, што і ў гледачоў, і ў акцёраў ёсць нешта агульнае – гэта любоў да тэатра і імкненне да светлага і добрага.

У планах тэатра – пастаноўка спектакля «Дарагая Алена Сяргееўна», прэм'ера якога чакаецца ў пачатку лета.

Таксама «На балконе» 26 сакавіка прадставілі спектакль «Цудоўнае перасяленне. Выpадкі» па п'есе Мікалая Рудкоўскага. У цэнтры спектакля – трагедыя жанчыны, мужчыны, народа. З розных куткоў свету героі распавядаюць сваю гісторыю. Глядач для сябе мог адзначыць, што перажыванні і праблемы персанажаў ва ўсе часы актуальныя.

Закрывалі «Тэатральны тыдзень» акцёры «На філфаку» 27 сакавіка спектаклем «Кентэрвільскі прывід» па творы Оскара Уальда. Гэта пастаноўка ўжо каля 5 гадоў знаходзіцца ў рэпертуары «На філфаку», паказвалі яе ў гэты раз ужо абноўленым складам. Вядомы сюжэт распавядае пра лёс прывіда сэра Сімона дэ Кентэрвіля, які забіў сваю жонку. Праз многія гады ў замак прыехалі новыя жыхары. Ці атрымаецца ў іх разгадаць загадку паскудлівай здані?

«Тэатральны тыдзень БДУ», прымеркаваны да прафесійнага свята, наводзіць на думкі пра важнае: тэатр – скарбніца пачуццяў і эмоцый, а перадаюць гэта багацце выдатныя ўніверсітэцкія каманды, дзе не баяцца пераўвасабляцца ў любых персанажаў і пражываць чужыя драмы. Аднак адзначым, што праводзіць вольны час у тэатры можна не толькі ў вылучаныя «тыдні», але і часцей. Сачыце за афішай.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 18.04.2018 г.
Зак. 373. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by